Такім чынам, Касцюшка як вайсковы інжынер амерыканскай арміі ўнёс значны ўклад у барацьбу за незалежнасць ЗША. Для амерыканскага народа ён стаў адным з самых паважаных сыноў зямлі Беларускай.

Сёння памяць пра Тадэвуша Касцюшку ў ЗША з'яўляецца адным з фактараў, які мэтазгодна выкарыстаць у інтарэсах Беларусі дзеля актывізацыі адносін паміж ЗША і Рэспублікай Беларусь, умацавання незалежнасці Беларускай дзяржавы.

**Спіс крыніц**

1. *Юхо, Я. А.* Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. — Мн.: Універсітэтскае, 1992. — 270 с.
2. Нарысы гісторыі Польскай дзяржавы і Народа : X—XXI стст. — Варшава : Demart Sp. z o. o. — 2006. — 312 с.
3.Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мн. : БелЭн, 1997. — 432 с. — Т. 4.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ КРЫНІЦЫ АБ СКАНДЫНАЎСКІМ ПАХОДЖАННІ ЗНАЦІ ВКЛ

***Я. Ю. Катаева***
Навуковы кіраўнік — *А. У. Літвінскі*
Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

У наш час, калі адбываецца станаўленне Рэспублікі Беларусь, узрастае цікавасць да мінулага беларускага народа, у прыватнасці, да перыяду знаходжання Беларусі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Па гэтай прычыне вывучэнне дыскусійных пытанняў гісторыі ВКЛ з'яўляецца актуальным. Сярод такіх пытанняў неабходна назваць пакуль што далёкую ад навуковага вырашэння праблему паходжання вялікіх князёў літоўскіх і літоўскай знаці. Існуюць розныя версіі іх паходжання. Адной з найбольш перспектыўных з'яўляецца гіпотэза, паводле якой продкамі вялікіх князёў літоўскіх былі выхадцы з тэрыторыі Скандынаўскага паўвострава, населенага народамі германскай групы індаеўрапейскай моўнай сям'і. Маецца на ўвазе этнічная сувязь ліцвінаў з паўночна-германскімі народамі.

Дадзеная версія ў недастатковай ступені распрацавана ў гістарычнай навуцы, таму разгляд гэтай навуковай праблемы мае іннавацыйны характар. Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца вызначэнне ступені абгрунтаванасці гэтай гіпотэзы. Задачы даследавання вызначаюцца яго мэтай і прадугледжваюць аналіз гістарычных (у тым ліку, археалагічных і геральдычных) і лінгвістычных аргументаў на карысць сфармуляванай вышэй гіпотэзы. У якасці метадалагічных прынцыпаў аўтарам выбраны прынцыпы навуковай аб'ектыўнасці і гістарызму. Асноўнымі метадамі даследавання з'яўляюцца параўнальна-гістарычны і метад структурна-функцыянальнага аналізу.

У «Хроніцы Быхаўца», «Хроніцы Літоускай і Жамойцкай» і іншых гаворыцца, што літоўская княжацкая група разам са сваім атачэннем прыйшла з Рыму (нібыта адтуль уцёк са сваімі спадарожнікамі Палямон, правадыр гэтай групы, ратуючыся ад капрызнага і жорсткага імператара Нерона). Хронікі падрабязна апісваюць, як яна трапіла ў вусце Нёмана і пачала пасоўвацца ўверх па рацэ, закладаючы гарады (замкі), падпарадкоўваючы сабе мясцовае насельніцтва. Аднак легенда пра паходжанне літоўскай княжай группы з Рыму не знаходзіць пацвярджэння ў гістарычных крыніцах [1, с. 56]. І ўсё ж, мабыць, паданне захавала нейкі ўспамін аб нетутэйшым паходжанні літоўскай знаці.

Зусім верагодна, што ў легендзе знайшоў адлюстраванне сапраўдны гістарычны факт скандынаўскай экспансіі на тэрыторыю літоўскага і беларускага Панямоння. Напэўна, нейкая скандынауская група ўвайшла з Балтыйскага мора у Нёман, стварыла апорны пункт пры вусці ракі і пачала паступова рухацца ўверх па Нёмане і яго прытоках, падпарадкоўваючы мясцовае жамойцкае насельніцтва. Беларускія і іншыя славянскія летапісы вельмі добра апісваюць гэты працэс, які закрануў спачатку балцкія, а потым усходнеславянскія (дакладней кажучы, беларускія) землі. Гэтая інфармацыя знаходзіць пацвярджэнне і ў скандынаўскіх гістарычных крыніцах [3, с. 42]. Зразумела, праз пэўны час нарманы, страціўшы сувязь з краінай свайго паходжання, паступова былі асіміляваны мясцовым насельніцтвам, аднак захавалі пэўнае ўяўленне пра свае адрозненні ад яго.

Аб наяўнасці скандынаўскага насельніцтва на тэрыторыі паўночна-заходняй Беларусі сведчаць археалагічныя знаходкі ў Гродне: фрагменты ўпрыгожанняў са скандынаўскім арнаментам, пярсцёнкі з рунічнымі знакамі (з гэтых знакаў складаўся старажытнаскандынаўскі алфавіт) [1, с. 61]. Магчыма, рунічнымі па сваім паходжанні з'яўляюцца адбіткі на цаглінах славутай Каложскай царквы. У якасці яшчэ аднаго з археалагічных аргументаў на карысць гіпотэзы скандынаўскага паходжання вялікіх князёў літоўскіх можна разглядаць наяўнасць абрада крэмацыі нябожчыкаў, характэрнага для паўночна-германскіх народаў і амаль не ўласцівага балтам.

Сярод гербаў літоўскай знаці вельмі часта сустракаюцца геральдычныя знакі, элементы якіх падобныя на літары рунічнага алфавіту. Прыкладам ужывання такога знака з'яўляецца герб рода Сапегаў «Ліс». Радавы

герб Гедымінавічаў «Калюмны» мае падабенства з сімвалам Рурыкавічаў «Трызубец» [2, с. 3]. Дынастыя Рурыкавічаў мела, хутчэй за ўсё, скандынаўскія карані.

Адным з доказаў нябалцкага паходжання літоўскіх князёў з'яўляецца тлумачэнне іх імёнаў [1, с. 57—58; 3, с. 42—44]. Старажытнагерманскія імёны часта складаліся з двух частак — слоў, што азначалі розныя пазітыўныя вартасці, такія, як удача, адвага, сіла, улада, багацце, кіраўніцтва, або важныя рэчы, такія, як лук, меч, кінжал. Гэтыя словы камбінаваліся ў бясконцую колькасць спалучэнняў, складаючыся ў імёны. Імёны двухскладовага тыпу дазваляюць інтэрпрэтацыю іх значэння. Ніжэй прыведзены магчымыя тлумачэнні імёнаў літоўскай знаці.

**Доў-герд**: dolk — кінжал, ger — дзіда. **Эй-монт**: eye — мець, mont — апека, сіла. **Еўнут**: evne — здольнасць,сіла. **Гашт-олт**: gast — марак, old — стары. **Геды-мін**: gedigen — праўдзівы, min — мой. **Коры-бут**: kori — кучаравы, bud — правадыр. **Скір-гайла**: skir — ясны, чысты, gajla — той, хто мае становішча. **Нары-мунт**: narig — суровы, няроўны, munt — сіла. **Аль-герд**: ol — усё, heard — чуючы. **Раг-валд**: rad — веславаць, vald — сіла, кіраванне. Можна яшчэ прывесці шэраг такіх прыкладаў [1, с. 57—58].

Такім чынам, з вялікай доляю ўпэўненасці можна сцвярджаць, што значная частка так званых «літоўскіх» імёнаў мае скандынаўскую этымалогію. Верагодна, што першыя скандынаўскія насельнікі тэрыторыі, якая потым стала называцца гістарычнай Літвой, добра разумелі сэнс сваіх імёнаў. Але ішоў час, і іх нашчадкі, у значнай ступені асіміляваныя мясцовым — балцкім і славянскім — насельніцтвам, паступова страчвалі сваю этнічную прыналежнасць, мову і традыцыі. Пры гэтым у асяроддзі вялікіх князёў літоўскіх захоўваліся і перадаваліся па традыцыі скандынаўскія імёны (хаця сэнс іх паступова забываўся), якія, акрамя ўсяго іншага, вылучалі іх носьбітаў з масы простага народа [3, с. 44].

Усе прыведзеныя вышэй аргументы сведчаць на карысць меркавання аб верагодным скандынаўскім паходжанні вялікіх князёў літоўскіх і значнай часткі знаці ВКЛ. Гэтая гіпотэза грунтуецца на звестках пісьмовых, рэчыўных, фальклорных і лінгвістычных крыніц. Аднак дадзенае сцвярджэнне мае патрэбу ў далейшай, усебаковай і комплекснай, навуковай праверцы.

## Спіс крыніц


1. *Галяк, Л.* Аб паходжанні аялікіх князёў літоўскіх / Л. Галяк // Спадчына. — 1993. — № 6. — С. 54—62.
2. Княжы знак «Сокал» / Спадчына. — 1994. — № 5. — С. 2—4.
3. *Чаропка, В.* Паходжанне і радавод вялікіх князёў літоўскіх / В. Чаропка // Беларускі гістарычны часопіс. — 2001. — № 6. — С. 42—53.